PolotskSU

УДК 821.113.1+81`25

«ПРАМОВЫ ВЫСОКАГА»: ПРАБЛЕМА ПЕРАДАЧЫ ФОРМЫ І ЗМЕСТУ ПРЫ ПЕРАКЛАДЗЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

канд. філал. навук Я.А. ПАПАКУЛЬ
(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)
j.papakul@psu.by

У артыкуле на прыкладзе «Прамоваў Высокага» разглядаецца спецыфіка перакладу эдычнай паэзіі на беларускую мову. Абгрунтоўваецца немагчымасць захавання традыцыйнай алітэратыўнай формы, а таксама даказваецца неабходнасць максімальна блізкай да арыгіналу перадачы зместу. Вялікая ўвага надаецца праблеме інтэрпрэтацыі асобных частак паэмы. Артыкул суправаджаецца цытатамі на старажытнаісландскай і рускай мовах, а таксама ўласнымі перакладамі.

Ключавыя словы: *эдычная паэзія, алітэрацыя, льёдахат, інтэрпрэтацыя, сэнсавае дапушчэнне.*

Старажытнаісландская паэма «Прамовы Высокага» (*Hávamál)* – самая вялікая з усіх эдычных паэм. Нягледзячы на тое, што ўвесь твор уяўляе сабой выказванні аднаго прамоўцы – Высокага (то бок Одзіна), тэкст вельмі неаднародны. У ім жыццёвыя парады чаргуюцца з расповедамі пра любоўныя прыгоды Одзіна, дапаўняюцца гісторыяй з’яўлення рунаў. Пры ўсім гэтым, твор вельмі арганічны і цэласны, а сюжэтнае і тэматычнае чаргаванне дадае дынамічнасці далёка не маленькаму па аб’ёме тэксту і падтрымлівае чытацкую ўвагу.

Варта адзначыць, што першая частка паэмы («Жыццёвыя парады») вельмі моцна нагадвае моўнае спаборніцтва майстроў-скальдаў, бо шмат якія думкі паўтараюцца двойчы, але трохі іншымі словамі. Разам з тым, сучасны чытач не можа не заўважыць, наколькі актуальныя пытанні ўздымаюцца ў паэме: пачынаючы з правілаў паводзінаў у гасцях або пытанняў стасункаў паміж мужчынам і жанчынай і завяршаючы філасофскімі развагамі, кшталту стаўлення да крывадушнасці, здрадніцтва, зла.

Пры перакладзе «Прамоваў Высокага» на беларускую мову першая складанасць звязаная з формай твора. Большая частка паэмы напісаная ў адмысловай алітэратыўнай форме *льёдахат* (*ljóðaháttr*), пры якой кожная страфа складаецца з шасці радкоў, дзе першае і другое трохрадкоўі маюць строгую структуру: два радкі аб’ядноўваюцца алітэрацыяй і маюць па два галоўныя націскі, трэці радок мае тры націскі і ўласную алітэрацыю [1, с. 11]:

«**Kó**pir **af**glapi
er til **ky**nnis **ke**mr,

PolotskSU

þylsk **ha**nn um eða **þru**mir;
allt er **se**nn,
ef hann **sy**lg of **ge**tr,
uppi er þá **geð** **gu**ma» [2].

Існыя пераклады на рускую мову грунтуюцца на розных падыходах. Так, С. Свірыдэнка (пераклад 1917 г.) захавала форму льёдахата, але толькі часткова (без алітэрацыі):

«Глупый в гостях
некстати болтает
или не в пору молчит;
выпив, покажет он
тотчас же каждому,
что мало ума у него» [3, с. 289].

А.І. Корсун у перакладзе 1975 г. цалкам адмаўляецца ад захавання і старажытнаісландскай формы, і алітэрацыі:

«Глазеет глупец,
приехавший в гости,
болтая иль молча;
а выпьет глоток –
и сразу покажет,
как мало в нем мудрости» [4, с. 191].

Пры гэтым пераклады на рускую мову скажаюць не толькі форму, але і змест арыгінальнага тэксту, бо ў страфе гутарка ідзе пра тое, што дурань паводзіць сябе так не ў гасцях увогуле, а ў гасцях у сваіх сяброў (*kynnis*). І тут варта зазначыць, што захаванне строгай старажытнаісландскай формы пры перакладзе не ўяўляецца магчымым, паколькі большасць словаў старажытнаісландскай мовы наўпрост карацейшыя за славянскія і звычайна не перавышаюць адзін-два склады. Таму ўжыванне льёдахата стварае рызыку значна спрасціць твор і пазбавіцца важных дэталяў. Такім чынам, пры перакладзе захаванне зместу бачыцца першачарговай задачай, у той час як мелодыку паэмы можна адмысловым чынам перадаць на беларускую мову праз асаблівую рытмічную арганізацыю тэксту:

«Дурань, што ў госці
да сябра прыходзіць,
моўчкі сядзіць ці мармыча няскладна;
ну а нап’ецца –
тут жа ўся дурасць
вылезе вонкі» [пераклад мой – *Я.П.*].

Другі важны момант – гэта цяжкасці інтэрпрэтацыі асобных частак паэмы. Твор напісаны ў XIII ст., таму з’явы і паняцці, зразумелыя людзям таго часу, сучаснаму чалавеку ўсвядоміць складана або нават немагчыма.

Адным з самых цяжкіх для інтэрпрэтацыі фрагментаў твора з’яўляецца страфа 137, прысвечаная сродкам дапамогі пры хваробах, суроках і г.д. Найбольшыя

PolotskSU

пытанні выклікае радок *höll við hýrógi* (даслоўна *зала [дапаможа] ад сваркі з радзінай*). Лічыцца, што лексема *höll* – памылка перапісчыка (павінна быць *haull* – грыжа), гэтаксама як і *hýrógi* – скажонае слова, што павінна азначаць *спарынню* [5]. У выніку радок неабгрунтавана перакладаюць на ангельскую, шведскую, рускую і інш. мовы як *спарыння (часам – бузіна) [дапаможа] ад грыжы*. Але ў такім выпадку атрымліваецца, што абодва словы не толькі напісалі з памылкамі, але яшчэ і змянілі структуру фрагмента, перарваўшы сінтаксічны паралелізм у страфе, паколькі ўва ўсіх іншых радках першым называецца сродак, а толькі пасля – ад чаго ён дапамагае. Пагадзіцца з такім падыходам цяжка.

Ва ўласным перакладзе мы ўжываем варыянт *ну а размова [дапаможа] ад сваркі з радзінай.* Калі дапусціць, што першае слова *höll* – сапраўды памылка перапісчыка, трэба было знайсці сугучнае слова з наборам зычных *h* і *l*. Найлепшым варыянтам падалося слова *hjal* – *гутарка*, *размова*. Спакойная размова можа дапамагчы ў сварцы. А ўлічваючы, што *зала* – выдатнае месца для такой спакойнай размовы, дадзены варыянт не супярэчыць і арыгінальнаму значэнню *höll.*

Такім чынам, пры перакладзе паэмы «Прамовы Высокага» больш важным бачыцца захаванне зместу, а не формы твора, паколькі паўнавартасны льёдахат праз асаблівасці мовы магчымы выключна ў скандынаўскай літаратуры. А любыя сэнсавыя дапушчэнні, выкліканыя цяжкасцямі інтэрпрэтацыі, павінныя быць абгрунтаванымі, а не засноўвацца на суб'ектыўным бачанні і прэферэнцыях канкрэтнага перакладчыка.

ЛІТАРАТУРА

1. Den poetiska Eddan / översättning med inledning och kommentar av L. Lönnroth. – Stockholm : Atlantis, 2016. – 528 s.
2. Hávamál (древнеисландский текст, ред. Guðni Jónsson). Старшая Эдда. – Тексты. – Северная Слава [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://norroen.info/src/edda/havamal/on.html. – Дата доступа: 29.09.2020.
3. Эдда. Скандинавский эпос / пер., введение, предисл. и коммент. С. Свириденко. – М. : М. и С. Сабашниковы, 1917. – 383 с.
4. Библиотека всемирной литературы. Сер. первая. Т. 9: Беовульф. Старшая Эдда. Песнь о Нибелунгах / под общ. ред. С.Е. Шлапоберской. – М.: Худож. лит., 1975. – 770 с.
5. An Icelandic-English Dictionary Based on the MS. Collections of the Late R. Cleasby Enlarged and Completed by G. Vigfusson, M.A. [Electronic resource]. – [Mode of access]: http://norroen.info/dct/cleasby/. – [Date of access]: 25.09.2020.

«РЕЧИ ВЫСОКОГО»: ПРОБЛЕМА ПЕРЕДАЧИ ФОРМЫ И СОДЕРЖАНИЯ ПРИ ПЕРЕВОДЕ НА БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫК

Е.А. ПАПАКУЛЬ

В статье на примере «Речей Высокого» рассматривается специфика перевода эддической поэзии на белорусский язык. Обосновывается невозможность

PolotskSU

сохранения традиционной аллитеративной формы, а также доказывается необходимость максимально приближенной к оригиналу передачи содержания. Большое внимание уделяется проблеме интерпретации отдельных частей поэмы. Статья сопровождается цитатами на древнеисландском и русском языках, а также собственными переводами.

Ключевые слова: *эддическая поэзия, аллитерация, льёдахатт, интерпретация, смысловое допущение.*

«HÁVAMÁL»: THE PROBLEM OF THE FORM AND CONTENT WHEN TRANSLATING INTO THE BELARUSIAN LANGUAGE

Y. PAPAKUL

The article is devoted to the specificity of the translation of Eddic poetry into the Belarusian language with «Hávamál» as the example. The impossibility of the preserving of the traditional alliterative form is substantiated, as well as the necessity of conveying the content as close to the original as possible is proved. Much attention is paid to the problem of interpretation of definite parts of the poem. The article is accompanied by quotations in Old Icelandic and Russian, as well as our own translations.

Keywords: *Eddic poetry, alliteration, ljóðaháttr, interpretation, semantic assumption.*

PolotskSU

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

МИРОВАЯ ЛИТЕРАТУРА В СТАНОВЛЕНИИ: ПЕРЕКРЕСТКИ – КОНТАКТЫ – ПОСРЕДНИКИ

Электронный сборник материалов
международной научной конференции

(Полоцк, 15–16 октября 2020 г.)

Текстовое электронное издание

Новополоцк
Полоцкий государственный университет
2021

Об издании – 1, 2

PolotskSU

1 – дополнительный экран – сведения об издании
УДК 82.0(100)(063)
ББК 83.0(0)я431

Рекомендован к изданию методической комиссией гуманитарного факультета Полоцкого государственного университета (протокол № 5 от 24.05.2021 г.)

РЕЦЕНЗЕНТ:

д-р філал. навук, праф., праф. кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Л. Д. СІНЬКОВА

Ответственный за выпуск:
Е. В. Лушневская

МИРОВАЯ ЛИТЕРАТУРА В СТАНОВЛЕНИИ: ПЕРЕКРЕСТКИ – КОНТАКТЫ – ПОСРЕДНИКИ [Электронный ресурс] : электрон. сб. материалов Междунар. науч. конф., Полоцк, 15–16 октября 2020 г. / Полоц. гос. ун-т ; отв. за вып.: Е. В. Лушневская. – Новополоцк : Полоц. гос. ун-т, 2021. – 1 электрон. опт. диск (CD-R).
ISBN 978-985-531-774-7.

В сборник вошли научные статьи, позволяющие представить проблематику изучения истории литературы на более широком контекстуальном уровне. Актуальность тематики международной научной конференции «Мировая литература в становлении: перекрестки – контакты – посредники» подчеркивается необходимостью осмысления стремительной интеграции гуманитарных наук за последние десятилетия, приводящей зачастую не столько к положительным результатам, сколько к произвольному и неоправданному заимствованию терминологического аппарата из самых разных наук.

Предназначена исследователям, преподавателям, аспирантам филологического профиля.

Сборник включен в Государственный регистр информационного ресурса.
Регистрационное свидетельство № 3172126562 от 09.09.2021.

Сборник входит в Российский индекс научного цитирования.

211400, ул. Стрелецкая, 4, г. Полоцк, Витебская обл., Республика Беларусь
тел. 8 (0214) 42-87-03
e-mail: k.lushneuskaya@psu.by

№ госрегистрации 3172126562
ISBN 978-985-531-774-7
©Полоцкий государственный университет, 2021

PolotskSU

2 – дополнительный титульный экран – производственно-технические сведения

Для создания текстового электронного издания «Мировая литература в становлении: перекрестки – контакты – посредники» использованы текстовый процессор Microsoft Word и программа Adobe Acrobat XI Pro для создания и просмотра электронных публикаций в формате PDF.

МИРОВАЯ ЛИТЕРАТУРА В СТАНОВЛЕНИИ:
ПЕРЕКРЕСТКИ – КОНТАКТЫ – ПОСРЕДНИКИ

Электронный сборник материалов
международной научной конференции
(Полоцк, 15–16 октября 2020 г.)

Техническое редактирование и верстка *С. Е. Рясовой.*
Компьютерный дизайн *М. С. Мухоморовой.*

Подписано к использованию 27.10.2021.
Объем издания: 2 Мб. Тираж 3 диска. Заказ 715.

Издатель и полиграфическое исполнение:
учреждение образования «Полоцкий государственный университет».

Свидетельство о государственной регистрации
издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/305 от 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 от 08.05.2014.

211440, ул. Блохина, 29,
г. Новополоцк,
Тел. 8 (0214) 59-95-41, 59-95-44
http://www.psu.by